# Проблемы исторической регионалистики



## Материалы Международной научно-практической конференции

## Часть I

30 марта 2010 г.

**Министерство образования и науки Российской Федерации**
**Государственное образовательное учреждение**
**высшего профессионального образования**
**«Чувашский государственный педагогический университет**
**им. И. Я. Яковлева»**

# Проблемы исторической регионалистики

## Часть I

## Материалы Международной научно-практической конференции

Чебоксары
2010

ББК 63.3 (2 Рос. Чув.)

Проблемы исторической регионалистики: материалы Международной научно-практической конференции «Проблемы исторической регионалистики» Часть I / отв. ред. Г. И. Тафаев. – Чебоксары: Чуваш. гос. пед. ун-т, 2010. - 226 с.

Печатается по решению ученого совета ГОУ ВПО «Чувашский государственный педагогический университет им. И. Я. Яковлева»

Ответственный за выпуск
Г. И. Тафаев, доктор исторических наук, профессор

Сборник научных статей подготовлен на основе материалов Международной научно-практической конференции «Проблемы исторической регионалистики», проведенной ЧГПУ им. И. Я. Яковлева 30 марта 2010 года в городе Чебоксары.

Авторами статей являются ученые из Белоруссии, Болгарии, России, Украины, Молдовы.

Адресуется научным работникам, учителям, студентам.

© Кафедра региональной истории, коллектив, 2010
© ГОУ ВПО «Чувашский государственный
педагогический университет им. И. Я. Яковлева», 2010

нов. БАН. София, 1984. С. 18, 22; Он же: Памятники древнетюркской письменности и этнокультурная история Центральной Азии. СПб., 2006. С. 317; Ваклинов С. Формирование на старобългарската култура. VI - XI век. София, 1977. С. 98 - 103].

Положение о тюркских истоках бога Тенгри-хана у гуннов Прикаспия поддерживали А.П. Новосельцев [Новосельцев А.П. Хазарское государство и его роль в истории Восточной Европы и Кавказа. М., 1990. С. 145] и А.В. Гадло [Гадло А.В. Религиозная реформа в «стране гуннов» в VII в. как выражение социального конфликта периода становления классового общества // Тез. докл. Генезис, основные этапы, общие пути и особенности развития феодализма у народов Северного Кавказа. Махачкала, 1980. С. 146].

Цари Первого Болгарского царства в VII - VIII вв. также приносили жертвы богу Тангре. Одна из надписей Мадарского святилища – крупнейшего культового центра праболгар, увековечила память о принесении жертвоприношения богу Тангре ханом Омуртагом (814 - 831): «Кан сюбиги Омуртаг от бога владетел…беше…и направи жертвоприношения на бога Тангра…ичиргу (колобър?)…» [Бешевлиев В. Първобългарски надписи. Второ преработено и допълнено издание. София, 1992. С.132].

С.Г. Кляшторный на основании тождества обряда жертвоприношения божеству Неба у тюрков и гунно-булгар Прикаспия заключил: «Детальные совпадения ритуального характера показывают, что албанский и китайский информатор повествует об одной и той же религии, об одном и том же культе, сохранившемся как в Центральной Азии, так и у западнотюркских племен и носившем черты глубокой (гуннской) древности» [Кляшторный С.Г. Мифологические сюжеты в древнетюркских памятниках // Тюркологический сборник. М.1977. М., 1981. Прим. 63. С. 132].

По данным рунических текстов, Тенгри «неявно антропоморфизован» [Кляшторный С.Г. Памятники древнетюркской письменности и этнокультурная история Центральной Азии. СПб., 2006. С. 254], но его персонификация восстанавливается, как отмечалось, по представлениям гунно-булгар Прикаспия (VII в.), зафиксированным Мовсесом Каланкатуаци.

Сакральные цари были и у дунайских болгар до 814 г. [Степанов Ц. Развитие на концепцията за сакралния цар у Хазарите и Българите през ранното средновековие // Българи и Хазари през ранното средновековие. Bulgars and Khazars in the early middle ages. Център за изследвания на Българите Тангра Тан Нак Ра ИК София, 2003. С. 249], болгары чтили «солнце, месяц и остальные звезды» [Бешевлиев В. Пъервобългарите. Бит и култура. София, 1981. С. 75].

Реконструкция конфессиональных представлений населения Прикаспийского Дагестана позволила установить культурологическое соответствие характера и содержания конфессиональных верований праболгар и булгар Юго-Восточной Европы.

Мифология, обрядность, архаические верования и т.п., привнесенные на болгарскую почву гунно-булгарскими племенами Северного Кавказа, в большей или меньшей степени оказали влияние на религиозные верования

дунайских праболгар с их культом главного небесного бога Тангра (Тенгри, Тенгри-хана). Подобная ситуация наблюдается у праболгарских этносов Дуная и в отношении женских божеств и богов путей.

В рассматриваемое время верования гунно-булгарских номадов в новой географической (почти идентичной Прикаспийскому Дагестану) и этнокультурной среде не только сохранили приверженность своему пантеону, но и прошли процесс адаптации, о чем свидетельствуют религиозные представления дунайских болгар.

Означенная религиозная практика сохранялась до IX в. По данным Г.Г. Литаврина, в период крещения Болгарии (864–866 гг.) в обществе сложился культурно-идеологический дуализм. Противниками христианизации выступила та часть высшей протоболгарской аристократии, для которой религия предков отождествлялась с этнической идентичностью, в силу чего эта группа населения «…восприняла крещение как смертельную для себя опасность» [Литаврин Г.Г. Славяне и протоболгары: от хана Аспаруха до князя Бориса-Михаила // Славяне и их соседи. Славяне и кочевой мир. М., 2001. Вып. 10. С. 31].

**Вабішчэвіч А. М.**

## НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.): ПРАБЛЕМЫ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ, ТЫПАЛОГІІ ЎЗАЕМААДНОСІН

У артыкуле аўтар паспрабаваў выдзеліць перыяды ў ажыццяўленні нацыянальна-культурнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., а таксама асноўныя тыпы (віды) адносін паміж рознымі нацыянальнымі і этнаканфесійнымі супольнасцямі ў грамадска-культурнай сферы. Пры ажыццяўленні перыядызацыі за аснову ўзяты ідэалогія і рэальная практыка дзяржаўнай нацыянальна-культурнай палітыкі, яе выніковасць; агульны стан і перспектывы існавання культур розных этнасаў, працэсы ў грамадска-палітычным жыцці. Аўтар вылучыў 3 асноўныя перыяды – 1921–1925 гг., 1926–1934 гг., 1935–1939 гг., даў ім характарыстыку. Выкарыстоўваючы ў якасці крытэрыя для тыпалогіі нацыянальна-культурных адносін іх характар, выдзелены 2 асноўныя тыпы: першы – канфрантацыйныя, канфліктныя, непрыязныя польска-беларускія адносіны, а таксама адносіны палякаў з рускімі, украінцамі, літоўцамі; другі – адносіны суіснавання і супрацоўніцтва, якія ахоплівалі этнакультурныя кантакты палякаў з яўрэямі, татарамі, стараабраднікамі, а таксама адносіны беларусаў з іншымі этнасамі (акрамя палякаў).

Уводзіны

Грунтоўнае вывучэнне нацыянальнай палітыкі ўрадаў Польшчы ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі пачалося на сучасным этапе. Сярод шэрагу прац неабходна вылучыць дысертацыю А.М.

Загідуліна, у якой зроблены аглядавы аналіз нацыянальнай і канфесіянальнай палітыкі польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва [1]. Узважлівым падыходам пры аналізе дзейнасці польскіх органаў дзяржаўнай бяспекі вылучаецца манаграфія польскага вучонага В. Сляшыньскага [2]. Аднак пакуль асобныя праблемы нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускіх зямель застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў. Актуальнасць вывучэння пытанняў, звязаных з рэалізацыяй нацыянальнай палітыкі Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі, характарам этнакультурных узаемаадносін, тлумачыцца таксама наяўнасцю пераважна ў польскіх навукова-папулярных выданнях, мемуарнай літаратуры ідэалізаваных ацэнак мірнага суіснавання розных этнасаў ў міжваеннай Польшчы. У асобных сучасных выданнях ажыццяўляюцца спробы рэабілітацыі грамадска-культурнай дзейнасці польскай супольнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая быццам спрыяла працэсам беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння.

Менавіта таму мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца ажыццяўленне перыядызацыі нацыянальна-культурнай палітыкі польскіх улад, тыпалогіі адносін паміж рознымі нацыянальнымі і этнаканфесійнымі супольнасцямі ў грамадска-культурнай сферы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Адзначаныя праблемы толькі фрагментарна закраналіся ў папярэдніх аўтарскіх распрацоўках [3, с. 58, 126–127; 4, с. 261–264]. Вынікі даследавання такіх складаных пытанняў будуць карыснымі для разумення цэлага комплекса нацыянальна-культурных адносін пасля ўз'яднання заходнебеларускіх зямель з БССР і правядзення там пераўтварэнняў на савецкай аснове (1939–1941 гг.), а таксама ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенныя дзесяцігоддзе.

Эвалюцыя нацыянальна-культурнай палітыкі польскіх улад

У рэальнай палітыцы дамінуючыя пазіцыі як на ўрадавым узроўні, так і асабліва сярод адміністрацыйнага апарату на тэрыторыі Заходняй Беларусі набыў нацыянальна-дэмакратычны праект, які абсалютызаваў монанацыянальны (польскі) характар дзяржавы, прадстаўляў польскую культуру ў якасці вышэйшай, цывілізаванай. Гэта арганічна ўкладвалася ва ўрадавую нацыянальную палітыку першай паловы 1920-х гг. – палітыку нацыянальнай асіміляцыі. Адначасова рабіліся спробы выкарыстання тэорыі рэгіяналізацыі. Польскія ўрады У. Сікорскага (снежань 1922 г. – май 1923 г.), У. Грабскага (снежань 1923 г. – лістапад 1925 г.) імкнуліся падтрымліваць планы ваяводскіх улад. Адзін з такіх планаў прадстаўляў у 1923 г. палескі ваявода С. Даўнаровіч [5, арк. 5–6]. Хоць асобныя палажэнні праекта мадыфікаваліся да 1939 г. наступнымі кіраўнікамі Палескага ваяводства, аднак нельга пагадзіцца з прызнаннем яго самым аптымальным для вырашэння нацыянальных праблем на Палессі [6, с.11], бо распрацоўваўся ён выключна з пазіцыі польскіх нацыянальных інтарэсаў, не мог прывесці да карэнных пераўтварэнняў у галоўных сферах грамадскага жыцця мясцовага насельніцтва.

Для зняцця міжнацыянальнага напружання, выкліканага гвалтоўным правядзеннем у жыццё згаданага нацыянальна-дэмакратычнага праекта, у дапаўненне да гарантый канстытуцыі Польшчы 1921 г. і міжнародных абавязацельстваў, прадугледжаных Дагаворам аб абароне нацыянальных меншасцей (Малым Версальскім трактатам) 1919 г., урадавыя колы паспрабавалі ажыццявіць прававое ўрэгуляванне ў сферы культуры, адукацыі і мовы нацыянальных супольнасцей. Паводле прынятых польскім сеймам 31 ліпеня 1924 г. г. зв. "крэсовых законаў", для беларусаў, украінцаў, літоўцаў былі прадстаўлены пэўныя правы ў выкарыстанні роднай мовы ў адносінах з уладамі, судовымі ўстановамі, вызначаны прынцыпы арганізацыі адукацыі на нацыянальных мовах [7]. Аднак новае заканадаўства мела сур'ёзныя пралікі, абмежаваны характар. Рускія, яўрэі не атрымалі магчымасці стварэння дзяржаўных адукацыйных устаноў з нацыянальнымі мовамі выкладання. Заключанае ўрадам У. Грабскага 4 ліпеня 1925 г. пагадненне (ugoda) з яўрэйскімі парламентарыямі не ўнесла істотных змен у вырашэнне нацыянальна-культурных праблем яўрэйскага насельніцтва. У сакавіку 1926 г. цэнтральныя польскія органы ўлады падтрымалі сіяністскі рух [8] як меншае зло ў параўнанні з сацыялістычнай і камуністычнай ідэалогіяй. З-за ўрадавай нестабільнасці так і не была выпрацавана цэласная праграма ў нацыянальна-культурнай палітыцы.

Абвешчаны рэжымам "санацыі" пераход у нацыянальнай палітыцы да дзяржаўнай асіміляцыі, калі замест адстойвання выключна інтарэсаў польскай нацыі дэклараваўся прыярытэт інтарэсаў Польскай дзяржавы, Айчыны для ўсіх грамадзян, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці [9], быў запланаваны яшчэ да майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту, пра што сведчыць асобная дырэктыва міністра ўнутраных спраў У. Рачкевіча ў красавіку 1926 г. [10, арк. 10–12]. Аднак змены ў нацыянальнай палітыцы не мелі кардынальнага, сутнаснага характару, адрозніваліся больш метадамі яе правядзення. Не адбылося адмаўлення ад самой ідэі асіміляцыі няпольскага насельніцтва. Аналіз рэальнай практыкі паказвае, што аўтарытарны рэжым Ю. Пілсудскага ўсяго толькі некалькі гадоў выкарыстоўваў нязначныя ўступкі ў галіне культуры і асветы, якія часткова адпавядалі палажэнням кансерватыўнага і ліберальна-дэмакратычнага праектаў. Насуперак дэклараванай афіцыйнай палітыцы дзяржаўнай асіміляцыі, з канца 1920-х гг. фактычна адбылося вяртанне да папярэдняга нацыянальна-дэмакратычнага праекта, які пры дапаўненні мерамі рэпрэсіўнага характару праводзіўся да верасня 1939 г. Такі паварот звязаны як з адыходам ад дэмакратычных прынцыпаў у грамадска-палітычным жыцці, так і з манапольнай пазіцыяй мясцовага адміністрацыйна-паліцэйскага апарата, які адыйшоў у бок ранейшай, звыклай па зместу і метадах правядзення палітыкі нацыянальнай асіміляцыі. Улічваючы невялікую значнасць праведзеных змен у дзяржаўнай нацыянальна-культурнай палітыцы і незайдросныя перспектывы для культурнага жыцця этнічных супольнасцей, не маем падстаў для вылучэння ў якасці асобнага

перыяду непрацяглага і даволі супярэчлівага прамежку часу (1926–1929 гг.).

У пачатку 1930-х гг. рэжым "санацыі" ажыццявіў чарговыя захады па абмежаванню грамадзянскіх правоў і свабод. "Закон аб сходах" ад 11 сакавіка 1932 г. даў адміністрацыйнаму апарату кантрольныя функцыі за грамадскімі арганізацыямі [11]. Праведзеная ў пачатку 1930-х гг. рэформа адукацыі істотна абмежавала доступ заходнебеларускай моладзі да сярэдняй і вышэйшай школы. Заяву міністра замежных спраў Польшчы Ю. Бэка 13 верасня 1934 г. аб адмове польскага ўраду ад выканання міжнародных абавязацельстваў паводле Малога Версальскага трактату 1919 г. [12, с. 617] можна разглядаць у якасці своеасаблівага рубяжу ў пераходзе да больш радыкальных мер у вырашэнні нацыянальна-культурных праблем на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Пасля смерці Ю. Пілсудскага ў кіруючым польскім лагеры ўзмацніліся таталітарныя, клерыкальна-нацыяналістычныя тэндэнцыі. У дачыненні да ўцалелых арганізацыйных структур беларусаў, рускіх, украінцаў, літоўцаў быў выкарыстаны цэлы комплекс гвалтоўных мер. Пасля прыняцця адпаведных рашэнняў у лютым-красавіку 1936 г. [13, с. 3–47] да пачатку 1938 г. ажыццяўлялася шырокамаштабная ліквідацыя структур літоўскіх арганізацый – таварыства Св. Казіміра і таварыства "Рытас" (забаронены адпаведна 31 снежня 1937 г. і 28 лютага 1938 г.) [14, арк. 111адв.]. У пачатку снежня 1936 г. была забаронена дзейнасць беларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый – Таварыства беларускай школы і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры [15, арк. 445]. На працягу 1936–1938 гг. была праведзена канчатковая ліквідацыя беларускіх школ, арганізацый, газет, падпарадкаванне грамадска-культурнага жыцця моцнаму кантролю адміністрацыйна-паліцэйскага апарату. Адначасова з рэпрэсіўнымі дзеяннямі актывізавалася дзейнасць мясцовай адміністрацыі, ваенных колаў у напрамку ўзмацнення каланізацыі і нацыянальна-культурнай асіміляцыі Палесся і іншых рэгіёнаў Заходняй Беларусі.

Тыпалогія этнакультурных узаемаадносін

Аналіз этнакультурных узаемаадносін 2-х асноўных нацыянальных супольнасцей – беларусаў, як аўтахтоннай большасці (складалі 64–67% насельніцтва Заходняй Беларусі [4, с. 13]), і палякаў, як тытульнага этнасу ў межах Польскай дзяржавы (на заходнебеларускіх землях – 12–15% [4, с. 13]), высветліў наяўнасць канфрантацыі, што выключыла магчымасці для іх пазітыўнага ўзаемадзеяння ў галіне культуры. Канфлікт быў прадвызначаны палітычнымі, эканамічнымі, канфесіянальнымі, дэмаграфічнымі, сацыяльна-псіхалагічнымі фактарамі, прывілеяваным становішчам палякаў у вядучых сферах грамадскага жыцця. Нацыянальныя стэрэатыпы цесна перапляталіся з сацыяльнымі, класавымі. Падтрымка дзяржавы, рымска-каталіцкага касцёла, адукацыйных і культурна-асветніцкіх устаноў, розных грамадскіх арганізацый павінна была забяспечыць "польскую культурную экспансію".

Дамінуючай была тэндэнцыя культурна-моўнай асіміляцыі беларускага насельніцтва. Паланафільскія настроі не атрымалі падтрымкі заходнебеларускага грамадства і не маглі істотна паўплываць на агульны характар беларуска-польскіх культурных адносін. Пасля ліквідацыі арганізацыйных форм нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у канцы 1930-х гг. іх асіміляцыя набыла пагражальны характар, аднак не паспела набыць завершанага характару, не прывяла да незваротных этнатрансфармацыйных вынікаў.

Канфрантацыйны, непрыязны характар мелі этнакультурныя кантакты палякаў з рускімі, украінцамі, літоўцамі, у адносінах да якіх польскія ўлады праводзілі палітыку асіміляцыі. Пад прыкрыццём дэрусіфікацыі адбывалася насаджэнне рускім (разам са стараабраднікамі іх доля вагалася ад 0,6% у Навагрудскім ваяводстве да 3,5% у Віленскім [4, с. 14]) польскай мовы, культуры, традыцый. Паводле Л. Васілеўскага, рускія і іх культура з'яўляліся "перажыткам русіфікатарскай эпохі" [16, арк. 7]. Да сярэдзіны 1930-х гг. адбыўся спад у дзейнасці рускіх арганізацый – Рускага дабрачыннага таварыства, Рускага народнага аб'яднання і інш. [15, арк. 10]. Колькасць рускіх гімназій у Польшчы зменшылася з 20 у пачатку 1920-х гг. да 5 у сярэдзіне 1930-х гг., сярод якіх былі гімназіі ў Брэсце і Вільні [17, арк. 9; 18, арк. 140].

На ўзроўні рэгіянальных уладных структур істотна абмяжоўвалася культура, асвета ўкраінцаў, якія пражывалі ў паўднёвых паветах Палескага ваяводства (паводле афіцыйных звестак 1931 г. складалі там 4,8% насельніцтва [4, с. 15]). Ва ўмовах рэпрэсій з боку польскіх улад у пачатку 1930-х гг. адбыўся заняпад дзейнасці таварыства "Просвіта" на Палессі. У красавіку 1933 г. "Просвіта" мела ўсяго 3 чытальні – у Брэсце, Арэхаве Брэсцкага павета, Блотах Кобрынскага павета [19, арк. 43адв., 62адв.]. Крытычным было становішча адзінай украінскай школы ў Брэсце. Пры актыўным удзеле заходнеўкраінскіх партый і арганізацый ажыўленне ўкраінскай грамадска-культурнай дзейнасці на Палессі назіралася ў канцы 1930-х гг.

Напружаны характар польска-літоўскіх адносін прадвызначаўся праблемай тэрытарыяльнай прыналежнасці Вільні. Пад уплывам знешняга фактару (падтрымкі з боку Літоўскай дзяржавы), культурна-агітацыйнай работы таварыстваў Св. Казіміра і "Рытас", дзе галоўную ролю ігралі ксяндзы і настаўнікі, мясцовае літоўскае насельніцтва было негатыўна настроена супраць польскіх школ, ухілялася ўсяго польскага [20, арк. 201адв.]. Літоўцы, якіх было не менш 80 тыс. чалавек [4, с. 15], у заходнебеларускіх мясцовасцях таксама падвяргаліся паланізацыі і нацыянальна-культурнай асіміляцыі.

У ходзе даследавання вылучаны і іншы тып этнакультурных адносін – суіснавання і супрацоўніцтва. Улічваючы колькасныя дэмаграфічныя паказчыкі, ступень адкрытасці і выніковасць адносін, статусныя пазіцыі ў грамадстве, неабходна асобна ад папярэдніх выдзеліць этнакультурныя

адносіны яўрэяў, татараў, старабраднікаў з палякамі (тытульным этнасам у Польскай дзяржаве), а таксама з іншымі нацыянальнымі супольнасцямі.

Яўрэйская супольнасць (налічвала ў 1931 г. да 375 тыс. чалавек [4, с. 14]) вылучалася адасобленым характарам этнаканфесійнага жыцця. Польска-яўрэйскае суіснаванне на заходнебеларускіх землях мела напружаны характар. Абвастрэнне адбывалася пад уплывам палітыка-ідэалагічных, сацыяльна-эканамічных, этнапсіхалагічных і іншых фактараў, асабліва з пачатку 1930-х гг. Ізаляваны і адметны характар этнакультурнага і рэлігійнага жыцця яўрэйскай абшчыны (кагала) выключаў магчымасць асіміляцыі яўрэяў. Менавіта таму адносна іх польскія ўлады актыўна выкарыстоўвалі самыя разнастайныя абмежавальныя меры, спрыялі эміграцыі. Правыя польскія сілы падтрымлівалі антысеміцкую кампанію.

Вялікі ўплыў на духоўнае жыццё яўрэяў у заходнебеларускіх землях аказвалі ўстановы Вільні, "літоўскага Іерусаліма", якія зрабілі значны ўклад у адраджэнне яўрэйскай ідышамоўнай літаратуры, культуры, мастацтва. Узаемаадносіны суіснавання яўрэйскай грамадскасці з польскімі дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі ў Вільні, а таксама ў заходнебеларускіх гарадах (напрыклад, у Пінску, Брэсце, дзе складалі адпаведна 63,4% і 44,3% жыхароў [4, с. 14] і інш.) мелі адносна ўстойлівы характар, хаця і паспыталі на сабе дэстабілізуючы ўплыў вышэй акрэсленых фактараў.

Частка яўрэйскай супольнасці не змагла пазбегнуць паланізацыі і культурна-моўнай асіміляцыі, хоць гэтыя працэсы і не набылі для яе пагражальнага характару. Яўрэйскае насельніцтва заходнебеларускіх зямель менш падвергласся асіміляцыі ў параўнанні з цэнтральнымі і заходнімі ваяводствамі Польшчы, Галіцыяй. Акультурацыя назіралася асабліва сярод яўрэйскай інтэлігенцыі, частка якой была інтэгравана ў польскае культурна-асветніцкае жыццё, займала адчувальнае становішча ў сферы навукі і культуры. Паводле ацэнак польскіх улад, на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства да вясны 1939 г. мясцовыя яўрэі ("літвакі") не змагі прывязацца да польскай дзяржаўнасці і культуры, карысталіся рускай мовай, складалі "пераважна дэструктыўны элемент, у лепшым выпадку абыякавы да Польскай дзяржавы" [21, арк. 6].

Ізаляваны і адасоблены характар нешматлікіх этнаканфесійных груп насельніцтва (старабраднікаў і татараў) адбіўся і на іх этнакультурных адносінах з палякамі. Старабраднікі (у 1937 г. – не менш 50 тыс. чалавек [4, с. 14–15]) праяўлялі палітычную лаяльнасць адносна дзяржаўных структур. Польскія ўлады меркавалі ў перспектыве пераўтварыць царкоўныя структуры старабраднікаў-беспапоўцаў у канкурэнта праваслаўнай царквы [22, с. 195]. Абшчыны старабраднікаў мелі права праводзіць рэлігійную, культурна-асветніцкую, дабрачынную дзейнасць [23, арк. 13; 24, арк. 1–3, 7–19]. Намаганнямі аднаго з лідэраў старабраднікаў, пасла Б. Піманава да канца 1930-х гг. у Вільні функцыянавала адзіная дзяржаўная руская школа для дзяцей старабраднікаў. Адметны характар грамадска-рэлігійнага жыцця, традыцыйнага побыту

старaабраднікаў, якія былі замкнуты ў межах уласнай этнаканфесійнай супольнасці, стрымліваў іх асіміляцыю [25, арк. 26адв.; 21, арк. 30].

Татарскае насельніцтва (5–6 тыс. чалавек [4, с. 16]) з яго этнічнымі і рэлігійнымі асаблівасцямі не ўяўляла вялікай пагрозы для польскіх нацыянальных інтарэсаў і дзяржаўнай бяспекі. Лідэры татарскай супольнасці пастаянна падкрэслівалі сваю лаяльнасць адносна Польскай дзяржавы, аказвалі падтрымку палітычнаму лагеру “санацыі”. Татарскія ідэолагі ўхіляліся ад публічнай нацыянальнай ідэнтыфікацыі татараў, прызнавалі толькі асобныя спецыфічныя нацыянальныя рысы – рэлігію, традыцыйныя абрады і звычаі, паходжанне [26, с. 24]. Хоць татары мелі магчымасці для захавання рэлігійных, культурных і грамадскіх традыцый, аднак адбывалася паланізацыя іх інтэлігенцыі, маёмасных слаёў. Паводле ацэнак польскіх улад, у пачатку 1939 г. у Крушынянах Гродзенскага павета і Багоніках Сакольскага павета татарскае насельніцтва жыло “ў сваіх рэлігійных абшчынах у культурнай адасобленасці ў беларускім акружэнні і з-за адсутнасці ўласнай інтэлігенцыі павольна падвяргалася паланізацыі” [21, арк. 31–32]. У архіўных крыніцах падобнае становішча зафіксавана і ў Віленскім ваяводстве.

Этнакультурныя ўзаемаадносіны беларусаў з іншымі супольнасцямі, акрамя палякаў, мелі ў асноўным пазітыўны характар. Беларуска-рускае супрацоўніцтва абапіралася на прыязныя, добрасуседскія адносіны. На ўзроўні арганізацыйных грамадскіх структур назіралася мірнае суіснаванне. Непаразуменне ўзнікала пераважна з-за ідэалагічных і палітычных супярэчнасцей. Беларускія нацыянальна-дэмакратычныя сілы негатыўна рэагавалі на вялікадзяржаўныя ідэі часткі лідэраў рускай супольнасці. У грамадска-царкоўным жыцці і паўсядзённых узаемаадносінах праваслаўных беларусаў выкарыстоўвалася руская мова, традыцыі рускай культуры [4, с. 92].

Міжкультурныя ўзаемаадносіны беларусаў і ўкраінцаў таксама мелі стабільны характар, асабліва ў 1920-я гг., калі на парламенцкім узроўні, паміж асобнымі партыямі і арганізацыямі адбывалася беларуска-ўкраінскае супрацоўніцтва. Аднак спрэчкі аб этнічным характары і тэрытарыяльнай прыналежнасці Палесся перашкаджалі плённаму беларуска-ўкраінскаму ўзаемадзеянню. Усе ўкраінскія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі адстойвалі ідэю стварэння незалежнай Украіны, у межы якой беспадстаўна ўключалі і беларускае Палессе.

Хоць яўрэі мелі замкнёны характар этнаканфесійнага жыцця, аднак у Вільні на ўзроўні свецкіх культурна-асветніцкіх арганізацый адбывалася сумеснае адстойванне нацыянальна-культурных інтарэсаў (разам з ТБШ, “Рытас”). Пазітыўны характар беларуска-яўрэйскіх адносін даваў магчымасць выкарыстоўваць часова матэрыяльную падтрымку яўрэяў. Летам 1923 г. А. Луцкевіч атрымаў ад яўрэяў Варшавы фінансавыя сродкі для друку і асветы. Вясной 1925 г. выказаў гатоўнасць аб дапамозе лідэр віленскай яўрэйскай супольнасці Ц. Шабад [27, с. 270]. Аднак з боку заходнебеларускіх партый і арганізацый не было адназначнага стаўлення

да яўрэйскіх арганізацый. Заходнебеларускія камуністы з канца 1920-х гг. непрыхільна ставіліся да яўрэйскіх культурна-асветніцкіх аб'яднанняў.

Ва ўмовах напружаных адносін з Польшчай літоўскія ўлады ў пачатку 1920-х гг. аказвалі падтрымку беларускім арганізацыям. Аднак пад уплывам геапалітычнай стабілізацыі, шэрагу этнапалітычных фактараў пасля 1923 г. назіраўся заняпад літоўска-беларускага супрацоўніцтва [28, арк. 6–7; 29, арк. 326–327]. Нягледзячы на спробы наладжвання ўзаемадзеяння ў Вільні, у сельскай мясцовасці ў другой палове 1920-х гг. літоўскія актывісты імкнуліся праводзіць культурна-асветніцкую працу адасоблена ад беларусаў. Складанымі былі ўзаемаадносіны заходнебеларускіх камуністаў з літоўскімі нацыянальнымі сіламі, адносна якіх выкарыстоўвалася тыповая прапаганда ("тэрор, дэмагогія ксяндзоў і літоўскіх нацыяналістаў, ідэалізацыя Літвы, адсталасць") [30, с. 83–84, 87]. Толькі з сярэдзіны 1930-х гг. назіралася некаторая станоўчая дынаміка ў адносінах з літоўскім рухам, прапаноўвалася супрацоўніцтва для адстойвання адукацыйных правоў беларусаў, літоўцаў, яўрэяў.

Хоць у 1920–1930-я гг. татары захоўвалі рэлігійную адметнасць, традыцыі і звычаі, аднак працягваўся працэс іх культурна-моўнай асіміляцыі, які пачаўся яшчэ ў папярэднія стагоддзі. Паводле С. Крычынскага, татарская інтэлігенцыя падверглася поўнай паланізацыі, сялянска-мяшчанскае насельніцтва – значнай беларусізацыі [31, с. 1]. Як паказвае аналіз разнастайных крыніц, у ходзе беларуска-татарскага ўзаемадзеяння адбывалася акультурацыя татараў. Татары ў паўсядзённым жыцці актыўна выкарыстоўвалі беларускую мову [32, с. 80]. Паводле ацэнак польскіх улад, "шлюбныя адносіны з хрысціянкамі спрыяюць асіміляцыі татараў, іх поўнай рэлігійнай індэферэнтнасці"[25, арк. 28].

Заключэнне

1. Праведзены аналіз тэарэтыка-ідэалагічных асноў, дзейнняў урадавых структур і мясцовай адміністрацыі ў галіне культуры і асветы нацыянальных супольнасцей, а таксама стану і перспектыў культурнага жыцця, дэтэрмінуючых грамадска-палітычных працэсаў дае падставы выдзеліць 3 перыяды ў рэалізацыі нацыянальна-культурнай палітыкі польскіх улад. У ходзе першага перыяду (1921–1925 гг.) польскія ўлады прыярытэт надавалі ажыццяўленню праекта, прапанаванага польскімі нацыянальна-дэмакратычнымі сіламі, які ігнараваў культурныя патрэбы няпольскага (асабліва славянскага) насельніцтва. Другі перыяд (1926–1934 гг.) характарызаваўся супярэчлівасцю ў рэалізацыі нацыянальна-культурнай палітыкі. Пасля непрацяглага і эпізадычнага выкарыстання элементаў кансерватыўнага і ліберальна-дэмакратычнага праектаў з канца 1920-х гг. адбылося фактычнае вяртанне да папярэдняй палітыкі нацыянальнай асіміляцыі. На працягу трэцяга перыяду (1935–1939 гг.) адбывалася актывізацыя дзейнняў урадавых колаў, мясцовай адміністрацыі па далейшай каланізацыі Заходняй Беларусі, нацыянальна-культурнай асіміляцыі яе насельніцтва.

2. Узяўшы за аснову характар адносін паміж рознымі нацыянальнымі і этнаканфесійнымі супольнасцямі ў грамадска-культурнай сферы, можна вылучыць 2 асноўныя іх тыпы (віды). Першы тып вызначаўся канфрантацыйнымі, канфліктнымі, непрыязнымі польска-беларускімі адносінамі, якія былі прадвызначаны грамадска-палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі, канфесіянальнымі, этнапсіхалагічнымі і іншымі фактарамі, ключавымі пазіцыямі палякаў у грамадскім жыцці. Пасля ліквідацыі арганізацыйных структур беларусаў іх нацыянальна-культурная асіміляцыя павінна была паскорыцца, аднак не паспела набыць завершанага характару. Такі ж характар мелі адносіны палякаў з рускімі, украінцамі, літоўцамі.

Другі тып ахопліваў адносіны суіснавання і супрацоўніцтва, якія былі вызначальнымі для этнакультурных кантактаў палякаў з яўрэямі, татарамі, стараабраднікамі, а таксама для адносін беларусаў з іншымі этнасамі (акрамя палякаў). Пры гэтым неабходна вылучыць некалькі падтыпаў: першы падтып – адносіны напружанага суіснавання палякаў і яўрэяў; другі падтып – адносіны стабільнага суіснавання і супрацоўніцтва стараабраднікаў, татараў з польскімі дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі; трэці тып – пераважна пазітыўныя этнакультурныя адносіны беларускай большасці з іншымі этнічнымі супольнасцямі, за выключэннем палякаў. У адрозненне ад беларусаў, украінцаў, літоўцаў, якія выразна імкнуліся да наладжвання паўнацэннага нацыянальна-культурнага жыцця ў межах уласнай дзяржаўнасці, нацыянальныя і канфесіянальныя меншасці (яўрэі, татары, стараабраднікі) імкнуліся праяўляць палітычную лаяльнасць і прыстасавацца да існуючых умоў, ізаляваліся ў межах уласнай этнаканфесійнай супольнасці.

Абмежаваныя магчымасці для грамадска-культурнай дзейнасці большасці нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў вызначаны храналагічны перыяд пазбаўлялі іх прагрэсіўнага, паступальнага нацыянальна-культурнага развіцця, абвастралі праблему іх самазахавання ва ўмовах паланізацыі і асіміляцыі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Загідулін, А.М. Нацыянальная і канфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.М. Загідулін; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2005. – 20 с.

2. Śleszyński, W. Bespeczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Śleszyński. – Warszawa: Officyna wydawnicza RYTM, 2007. – 400 s.

3. Белорусские земли между Россией и Польшей в XIX–XX столетиях: национально-культурные и общественно-политические факторы исторического развития: отчет о НИР (заключ.) / БрГУ им. А.С. Пушкина; рук. А.Н. Вабищевич. – Брест, 2007. – 141 с. – № ГР 20051874.

4. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

5. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zespół 9/1. – Sygn. 938. Нарыс праграмы, заданняў і дзяржаўных работ на Палессі палескага ваяводы С. Даўнаровіча (1.03.1933 г.).

6. Сляшынскі, В. Нацыянальная палітыка польскіх улад на землях Усходняй Літвы і Заходняй Беларусі / В. Сляшынскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 9. – С. 9–15.

7. Ustawa z dnia 31 lipca 1924 r. o języku państwowym i języku urzędowania rządowych i samorządowych władz administracyjnych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1924. – II półrocze. – № 73. – Poz. 724.

8. AAN. – Zespół 9/1. – Sygn. 1063. Цыркуляр МУС да ваяводаў аб пазіцыі ўрада да сіяніцкага руху (27.05.1926 г.).

9. Madajczyk, C. Dokumenty w sprawie polityki narodowościowej władz polskich po przewrocie majowym / C. Madajczyk // Dzieje najnowsze. – 1972. – № 3. – S. 137–169.

10. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 1087. Цыркуляры палескага ваяводы, указанні МУС аб прынцыпах нацыянальнай палітыкі і іншых пытаннях (1925–1927 гг.).

11. Ustawa z dnia 11 marca 1932 roku o zgromadzeniach // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1932. – № 48. – Poz. 450.

12. Białorusini // Sprawy narodowościowe. – 1934. – № 5-6. – S. 617–620.

13. Bociański, L. Ściśle tajny memorjał wojewody wileńskiego z dnia 11 lutego 1936 r. – Kaunas: V. Vaitkevičius, 1947. – 47 s.

14. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1176. Паўгадавыя справаздачы віленскага ваяводы (1937–1938 гг.).

15. AAN. – Zespół 9/1. – Sygn. 963. Справаздачы нацыянальнага аддзела аб жыцці нацыянальных меншасцей у Польшчы (1936 г.).

16. AAN. – Zespół 390. Akta Leona Wasilewskiego. – Sygn. 76. Нацыянальныя адносіны ў Польшчы. Руская меншасць. Артыкулы, нататкі, вытрымкі прэсы (1925 г.).

17. ДАБВ. – Фонд 114. – Воп. 1. – Спр. 30. Статут гімназіі; справаздачы аб дзейнасці праўлення Брэсцкага аддзела РДТ і пратаколы агульных сходаў (1932–1935 гг.).

18. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2428. Месячныя і квартальныя справаздачы віленскага ваяводы (студзень-май 1933 г.).

19. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 2408. Месячныя справаздачы палескага ваяводы (студзень-чэрвень 1933 г.).

20. Справаздача аб палітычнай сітуацыі за кастрычнік 1926 г. у пастарунку дзяржпаліцыі ў Берштах Гродзенскага павета // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 38. – Воп. 1. – Спр. 19. – Арк. 200–201адв.

21. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 1574. Рэферат беластоцкага ваяводы аб праблемах умацавання становішча і ўзмацнення ўплыву польскага насельніцтва ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці ваяводства (30.01.1939 г.).

22. Krasowski, K. Związki wyznaniowe w II Rzeczypospolitej: studium historycznoprawne / K. Krasowski. – Warszawa-Poznań: PWN, 1988. – 355 s.

23. AAN. – Zespół 14. – Sygn. 1270. Царква стараабраднікаў, якая не прызнае іерархіі (1922–1939 гг.).

24. AAN. – Zespół 9/1. – Sygn. 1079. Матэрыялы адносна стварэння царквы стараабраднікаў, якая не прызнае іерархіі (1928–1929 гг.).

25. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 10. – Спр. 2305. Справаздачы палескага і беластоцкага ваявод (1933–1939 гг.).

26. Od redakcji // Życie tatarskie. – 1937. – № 1. – S. 24.

27. Чарнякевіч, А. Псіхалогія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзела польскага Генеральнага штаба / А. Чарнякевіч, А. Пашкевіч // Arche = Пачатак. – 2005. – № 6. – С. 214–271.

28. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 282. Дакументы А. Цвікевіча (перапіска, інтэрв'ю) (1919–1925 гг.).

29. БДАМЛіМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 241. Нататкі, нарысы і даклады К. Дуж-Душэўскага аб беларускім нацыялістычным руху (1918–1930, 1935 гг.).

30. Інфармацыйны бюлетэнь аб Заходняй Беларусі. – Мінск, 1933. – № 9.

31. Kryczyński, S. Tatarzy-litewscy: proba monografii historyczno-etnograficznej / S. Kryczyński. – Warszawa: RC ZKOTRP, 1938. – XVI, 318 s.

32. Бітэль, П. Вішнева і вішнеўцы: краязнаўчы нарыс / П. Бітэль // Куфэрак Віленшчыны. – Маладзечна, 2000. – № 2 (2). – С. 68–86.

**Владимиров Г.**
Доктор по история, София, България

## ЮРИДИЧЕСКАТА КУЛТУРА НА ВОЛЖКА БЪЛГАРИЯ (IX-X в.)

Правото и юридическата култура на всеки народ са основна черта в неговия национален характер. В изследването на юридическите практики често се крие ключа към разбирането интерпретирането на историческото му поведение. Известно е, че всеки стабилен държавен организъм предполага прецизно регламентиране на отношенията в социума, който той олицетворява. Основен механизъм в този процес са нормативните регулативи, наречени закони. Законът означава ред, а редът – сигурност и бъдеще за държавата и обществото, в които той функционира. Напоследък изследователите доказаха стройната уредба на раннобългарските държави, което вероятно се дължи на действаща юридическа система, адекватно дефинираща отношението "държава–общество". Под "юридическа система" трябва да се разбира не само институционализираната нормативна уредба, но и обичайно-правните механизми, регулиращи обществените отношения. В сполучливия баланс на двете структури вероятно се крие рецептата на справедливата държавна уредба у древните българи.

За съжаление, до нас не са достигнали юридически образци дело на древните българи. По тази причина правната им история тъне в мрака на неизвестността. Историографската логика допуска предположението, че Старата Велика България, една от стабилните държави на седмото столетие, вероятно е притежавала съответната законова база. В края на 60-те години на VII век тя се преражда в две нови държави, приемници на нейните традиции и дух – Дунавска и Волжка България. И докато историографите описват детайлно историята и културата на първата, втората остава в периферията на изследователския интерес. Причините за подобно "пренебрежение" имат комплексен характер. Те не са обект на нашия интерес, който е ориентиран към формулирания проблем – юридико-правораздавателна култура на волжките българи.

Юридическите практики на българите до тяхната християнизация в Дунавска България и тяхната ислямизация във Волжка България представляват сравнително слабо проучена сфера от историческото битие на